УДК 070

# ЖУРФАК: ТРАДЫЦЫІ, АСОБЫ, ІНАВАЦЫІ. 80 ГОД ФАКУЛЬТЭТУ ЖУРНАЛІСТЫКІ БДУ

***В. П. ВАРАБ'ЁЎ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

***Анатацыя.*** Разглядаюцца працэс устанаўлення вучэбна-даследчых традыцый у калектыве, роля асобы выкладчыка ў жыцці адукацыйнага цэнтра, акрэсліваецца інавацыйны патэнцыял журналісцкай вышэйшай школы.

***Ключавыя словы:*** факультэт журналістыкі; традыцыі; асобы; інавацыйны патэнцыял.

# ЖУРФАК: ТРАДИЦИИ, ПЕРСОНАЛИИ, ИННОВАЦИИ. 80 ЛЕТ ФАКУЛЬТЕТУ ЖУРНАЛИСТИКИ БГУ

***В. П. ВОРОБЬЁВ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

***Аннотация.*** Рассматриваются процесс установления учебно-исследовательских традиций коллектива, роль личности преподавателя в жизни образовательного центра, обрисовывается инновационный потенциал журналистской высшей школы.

***Ключевые слова:*** факультет журналистики; традиции; личности; инновационный потенциал.

**Образец цитирования:**
Вараб'ёў ВП. Журфак: традыцыі, асобы, інавацыі. 80 год факультэту журналістыкі БДУ. *Журнал Белорусского государственного университета. Журналистика.* 2024;2:4–9.
EDN: YSRYDO

**For citation:**
Vorobiev VP. Faculty of journalism: traditions, personalities, innovations. 80th anniversary of the faculty of journalism of Belarusian State University. *Journal of the Belarusian State University. Journalism.* 2024;2:4–9. Belarusian.
EDN: YSRYDO

**Автор:**
***Василий Петрович Воробьёв*** – кандидат филологических наук, доцент; профессор кафедры медиалогии.

**Author:**
***Vasily P. Vorobiev***, PhD (philology), docent; professor at the department of medialogy.
*vorobyov57@gmail.com*

# FACULTY OF JOURNALISM: TRADITIONS, PERSONALITIES, INNOVATIONS. 80th ANNIVERSARY OF THE FACULTY OF JOURNALISM OF BELARUSIAN STATE UNIVERSITY

***V. P. VOROBIEV***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

***Abstract.*** The article is dedicated to the 80th anniversary of the faculty of journalism of Belarusian State University. The process of formation of educational and research traditions of the team, the role of the teacher's personality in the life of the educational centre, and the innovative potential of journalistic higher education are outlined.

***Keywords:*** faculty of journalism; traditions; personalities; innovative potential.

## Калектывізм. Руплівасць. Адказнасць

Калектывізм, руплівасць і адказнасць сталі асноўнымі прынцыпамі работы журфака пасля ўзнаўлення ў 1968 г. яго функцыянавання як самастойнай акадэмічнай структуры ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Галоўным архітэктарам і будаўніком вышэйшай журналісцкай адукацыі стаў ініцыятар самастойнасці факультэта Р. В. Булацкі (1968–1981). У артыкуле «Кузня журналісцкіх кадраў Беларусі» ён падводзіць наступныя вынікі: «Журналіст – гэта перш за ўсё актыўны баец... Іменна такіх журналістаў імкнецца рыхтаваць **калектыў** (тут і далей вылучана намі. – *В. В.*) супрацоўнікаў факультэта»[1] [1]. Рыгор Васільевіч падбіраў, камплектаваў і расціў калектыў сістэмна і прадбачліва: па яго ініцыятыве на факультэце пачала працаваць плеяда вядомых журналістаў-практыкаў, што ўзначалілі чатыры кафедры і стварылі цэнтр падрыхтоўкі і выхавання журналісцкіх кадраў (М. Е. Дастанка, Я. Р. Радкевіч, М. Я. Цікоцкі, Б. В. Стральцоў).

Дэкан П. І. Ткачоў (1981–1986) унёс у факультэцкае жыццё спецыфіку творчай запатрабаванасці і штодзённай вытворчай мабільнасці. У артыкуле «Учора, сёння, заўтра» Павел Іванавіч заўважае: «Пры вырашэнні праблемы творчасці журналістаў мы вылучаем некалькі аспектаў: **творчая асоба, творчыя здольнасці, творчы клімат і сам працэс творчасці**» [2, с. 5].

Дэкан А. Г. Слука (1986–1996) сваёй невычэрпнай энергіяй і камсамольскім агеньчыкам натхняў калектыў на панарамныя працоўныя і гістарычныя здзяйсненні. У артыкуле «Творчая лабараторыя» Алег Георгіевіч слушна адзначае: «У пачатку 90-х гадоў ва ўмовах выхаду Беларусі на самастойны шлях развіцця пачаўся сучасны этап журналісцкай адукацыі ва ўніверсітэце. У 1988 г. створана навукова-даследчая лабараторыя, у 1991 г. – спецыялізаваны савет па абароне кандыдацкіх дысертацый. У 1992 г. распрацаваны новы вучэбны план...» [3].

Калектывізм пры абмеркаванні і вырашэнні надзённых праблем вучэбна-выхаваўчай працы і адказнасць за лёс факультэта і яго выхаванцаў былі асноўнымі прынцыпамі, якімі карысталіся выкладчыкі факультэта ў 1997–2005 гг., у тым ліку і аўтар гэтых радкоў. У названы прамежак часу абноўленая і энергічная каманда журфака прадоўжыла памнажаць традыцыі таварыскасці, натхнёнасці, сумеснай творчай самаадданасці. Вынікаў плённай працы не давялося доўга чакаць. За год да 55-гадовага юбілею журфака адміністрацыі факультэта нарэшце ўдалося дабіцца выдзялення пляцоўкі пад будаўніцтва будучага дома журфака. Арганізаваныя дэканатам ў 1998 г. тэхніка-эканамічныя абгрунтаванні і грамадская экспертыза патрэб журналісцкай адукацыі ў краіне дазволілі перадаць на баланс, а затым спраектаваць і пачаць рэканструкцыю вучэбна-даследчага корпуса, прыступіць да будаўніцтва новага тэлецэнтра, бібліятэкі і паточных аўдыторый у комплексе БДУ на вул. Кальварыйскай. Намеснікі дэкана А. А. Рудэнка, Я. І. Дзмітрыеў, У. І. Ладуцька, С. І. Кавалёва шчыравалі над праектамі памяшканняў кафедр, вучэбных кабінетаў, прадумвалі іх тэхналагічнае абсталяванне. А 2000 студэнтаў, што навучаліся ў карпусах на вуліцах Маскоўскай і Мяснікова, правялі больш за сотню суботнікаў на будаўніцтве новага корпуса. Працэс уладкавання ўтульнага і функцыянальнага «сямейнага гнязда», на жаль, зацягнуўся на гады. Гэты перыяд значна амаладзіў калектыў, згуртаваў яго і натхніў на новыя пачынанні і назапашванне спадчыны факультэта[2].

Ключавым фактарам і каталізатарам развіцця журфака з'явілася адкрыццё пяці новых кафедр: у 1998 г. былі створаны кафедры сацыялогіі журналістыкі, перыядычнага друку, літаратурна-мастацкай крытыкі, у 1999 г. – кафедры тэхналогій камунікацыі, англійскай мовы і моўнай камунікацыі. Дзейсным сродкам згуртавання педагагічнага калектыву і «прышчэпкай» ад спарадычных праяў «хутарскіх абміцый» у інтэлігентным асяродку стала ўвядзенне пяці новых разгалінаваных спецыяльнасцей: «Інфармацыя і камунікацыя», «Аўдыёвізуальная журналістыка», «Друкаваныя СМІ», «Літаратурная работа»,

[1]Тут і далей пераклад наш. – *В. В.*

[2]*Воробьев В. П.* Белорусская модель журналистского образования – одна из лучших в Европе // Аргументы и факты. 2004. Снеж. № 48. С. 11.

«Міжнародная журналістыка». Павышэнню эфектыўнасці тэхналагічнай і метадычнай дзейнасці выкладчыкаў спрыяла стварэнне вучэбнага цэнтра камунікатыўных тэхналогій. Упершыню былі распрацаваны беларускія адукацыйныя стандарты, вучэбныя планы і праграмы для двухузроўневай падрыхтоўкі профільных кадраў. Нарэшце ўдалося замацаваць за журфакам права творчага адбору абітурыентаў праз сістэму профільных іспытаў і рэдакцыйныя алімпіяды ў маладзёжных выданнях. Была закладзена аснова сістэмнай мадэлі павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі супрацоўнікаў інфармацыйнай галіны. Прадстаўнікі журфака першымі ў рэспубліцы распрацавалі і ўкаранілі рэйтынгавую сістэму ацэнкі бягучай паспяховасці студэнтаў.

Спадкаемцы атрымалі ад пакалення выкладчыкаў пачатку XXI ст. шмат доўгатэрміновых напрацовак і пачынанняў. Неабходнасць усеабдымнага рэфармавання журналісцкай адукацыі ў краіне на мяжы тысячагоддзяў была выклікана самім жыццём, пераўтварэннямі ў сацыяльнай і палітычнай сферах. Трансфармацыю вучэбна-метадычнага працэсу ажыццяўляў літаральна ўвесь калектыў журфака. Асноўны цяжар гэтай самакрытычнай і мэтанакіраванай працы вынес «штаб» наменікаў дэкана, новы склад загадчыкаў кафедр (А. К. Свораб, Л. П. Саянкова, В. Р. Булацкі, Т. М. Дасаева, В. Р. Вашкевіч, П. Л. Дарашчонак, І. Ф. Ухванава).

Журналісцкая практыка і навуковы пошук выявілі патрэбу насычэння класічнай універсітэцкай праграмы навучання журналістаў дысцыплінамі сацыяльна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, сацыяльна-псіхалагічнага, прававога, тэхналагічнага профіляў. Недастатковае валоданне студэнтамі тэхнікамі збору, апрацоўкі, асэнсавання і інтэрпрэтацыі інфармацыі, а таксама эксплуатацыя інтуітыўна-сузіральных метадаў назапашвання фактаў спараджалі рамесніцкі падыход да стварэння матэрыялаў.

Шэраг прадметаў, уведзеных у вучэбны план, быў арыентаваны на выхаванне ў журналістаў-пачаткоўцаў трывалых навыкаў аб'ектывацыі фактаў жыцця ў палітычным, эканамічным, псіхалагічным кантэксце рэчаіснасці. Комплекс дысцыплін быў пабудаваны лагічна і дазваляў выпускнікам ажыццяўляць аўтарскую, арганізатарскую, рэдактарскую, праграмную і вытворча-тэхналагічную прафесійную дзейнасць.

Нарэшце міф пра дыскусійны характар базавага набору дысцыплін і базавай спецыялізацыі журналістаў быў развенчаны. Заснавальнікі і галоўныя рэдактары перыядычных выданняў дружна фіксавалі дасягнуты баланс попыту і прапаноў у выпрацаванай мадэлі журналісцкай адукацыі.

Альтэрнатывай рамесніцка-доследнаму шаблону прэсы стала сацыялагізацыя журналістыкі. Выйсце са складанай сітуацыі было знойдзена дзякуючы рэальнаму выкарыстанню ў штодзённай практыцы не толькі сігнальных, але і колькасных, а таксама якасных паказчыкаў рэчаіснасці.

Аб развіцці навуковай сферы на факультэце сведчылі не толькі аб'ём і якасць навуковых прац, але і тэмп кваліфікацыйнага сталення. Гэта акалічнасць дазволіла ўпершыню ў гісторыі журфака стварыць «доктарскі» савет па абароне дысертацый, што, у сваю чаргу, стымулявала паспяховую абарону чатырох доктарскіх дысертацый, вельмі чаканых пасля 15-гадовага перапынку. На факультэце была закладзена яшчэ адна трывалая перспектыўная традыцыя – правядзенне міжнародных навукова-практычных канферэнцый, што стварае ўмовы для штогадовага абагульнення міжнароднага і нацыянальнага вопыту журналісцкай тэорыі і практыкі і дазваляе аб'ектыўна асэнсоўваць сацыяльна-культурны статус журналістыкі і перспектывы яе развіцця[3].

## Гістарычныя асобы журфака

Замацаванне і развіццё трывалых традыцый факультэта адбываліся дзякуючы працы легендарных выкладчыкаў журфака. На двух з іх спынімся асобна.

**Нястомная падзвіжніца.** Менавіта з гэтымі словамі асацыіруецца постаць прафесара, доктара філалагічных навук, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, знакамітага кінакрытыка і заснавальніка беларускай школы кінадаследчыкаў, прадстаўніцы першага выпуску журфака Еўфрасінні Леанідаўны Бондаравай. Менавіта такой засталася ў памяці сваіх выхаванцаў і калег непаўторная, прынцыповая, рашучая, уважлівая і лагодная Еўфрасіння Леанідаўна.

Усе гады сваёй нястомнай працы ва ўніверсітэце яна з'яўлялася «генеральным канструктарам» студэнцкага навуковага таварыства, дзейсным арганізатарам даследчай школы факультэта. Еўфрасіння Леанідаўна не проста выконвала функцыю кіравання студэнцкімі гурткамі і навукова-практычнымі канферэнцыямі, а штодзённа была натхняльніцай студэнцкай творчасці.

Прадбачлівасць Е. Л. Бондаравай у пошуку даследчыцкіх талентаў сярод студэнцкай моладзі ўражвалі і ў той час. Праз дзесяцігоддзі яе здольнасць быць пранікнёным прагназістам чалавечых лёсаў атрымала пацверджанне. Кіраўнік журфакаўскага навуковага таварыства студэнт Аляксандр Астроўскі стаў рэдактарам першага ў СССР шматпалоснага штотыднёвіка, а потым – Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь у шэрагу краін Еўропы, Генеральным консулам у ЗША. Місіянерская настаўніцкая дзейнасць Еўфрасінні Леанідаўны падарыла журфаку шэраг асоб, якіх яна выпеставала ў навуковых гуртках, а затым вырасціла ў таленавітых выкладчыкаў і даследчыкаў журналістыкі, – Т. І. Чыгрынаву, Т. У. Падаляк, Л. П. Саянкову, В. А. Мядзведзеву. Пералічваць імёны-зоркі, што запаліла Еўфрасіння

[3] *Вараб'ёў В. П.* Творчы патэнцыял інфармацыйнай прасторы Беларусі // Звязда. 2004. 24 лістап. С. 3.

Леанідаўна, можна бясконца. Рабіць важкі ўнёсак у скарбонку талентаў журфака, беларускай кінакрытыкі, журналістыкі працягваюць узгадаваныя Е. Л. Бондаравай вучні.

Не забываюцца, а крышталізуюцца і становяцца больш выразнымі, рэльефнымі і красамоўнымі простыя асобасныя ўчынкі Еўфрасінні Леанідаўны. Пасля чарговай студэнцкай канферэнцыі, якую аўтару гэтых радкоў даручыла адкрываць Е. Л. Бондарава, яна прылюдна на прэзідыумнай трыбуне ўручыла яму звычайны духмяны абаранак... Маўляў, на абаранкі не атрымаеш, бо здолеў правесці пленарнае пасяджэнне студэнцкай канферэнцыі журфака як след, па яе высокіх стандартах. Даражэй гэтага падарунка-сімвала з рук аўтарытэта для тагачаснага трэцякурсніка і кіраўніка савета студэнцкага навуковага таварыства нічога не было. Гэты абаранак сімвалізаваў прызнанне самой Еўфрасінні Леанідаўны і цаніўся вышэй грамат і значкоў.

А літаральна праз год-паўтара прафесар Е. Л. Бондарава на імпрэзе ў культавым для журфака Доме кіно запрасіла аўтара дадзенага артыкула на кубачак кавы. Тады здалося, што багіня мудрасці і шчырасці адарыла яго шчаслівым білетам на ўсе экзамены жыцця. Без лішніх уступаў Е. Л. Бондарава вынесла вердыкт: «Ведаю, што сябруеце з Барысам Васільевічам, таму далейшы даследчыцкі шлях у цябе побач з ім».

Яе прысуд стаў прароцтвам, наказам і бласлаўленнем. Такая бескарыслівая дапамога-парада не забываецца. Невыпадкова ўдзячныя вучні Е. Л. Бондаравай адкрылі яе імянную аўдыторыю насупраць імяннной аўдыторыі Б. В. Стральцова. Два знакамітыя журфакаўскія настаўнікі назаўсёды прапісаны побач. Гэтак жа яны ішлі і па жыцці: па журналісцкім, даследчыцкім, настаўніцкім, асобасным і маральным напрамках.

***Святло маральнасці і кампетэнтнасці.*** Знакавай асобай і прыцягальным прафесіяналам застаўся навечна ў летапісе факультэта журналістыкі Барыс Васільевіч Стральцоў.

Пуцявіны лёсу творцы абудзілі ва ўчарашнім армейцы смак да беларускага слова і журналістыкі. Набываючы завочна адукацыю ў БДУ, Барыс Васільевіч загартаваў прафесійныя кампетэнцыі журналіста ў газетным горне раённага і маладзёжнага выданняў, а таксама ў газеце «Звязда».

Абарона змястоўнай, глыбокай кандыдацкай дысертацыі «Газета і мараль» падштурхнула Б. В. Стральцова да новай прыступкі жыцця і місіі ў ім – настаўніцтва. З 1967 г. ён паслядоўна становіцца спачатку дацэнтам, а потым загадчыкам кафедры. Настаўнік ад Бога і сейбіт разумнага, добрага, вечнага па вопыце журналісцкіх будняў на чатыры дзесяцігоддзі звязаў свае жыццё з БДУ. Маральныя каштоўнасці, што абараняў і папулярызаваў Б. В. Стральцоў у журналістыцы, у студэнцкім асяроддзі, не выцвілі ад часу ні ў кандыдацкім даследаванні, ні ў шматлікіх вучэбных дапаможніках і навуковых артыкулах. Рэфрэнам праз яго навуковую, педагагічную і публіцыстычную дзейнасць праходзіць думка, што журналістыка – гэта лад жыцця. Сучаснасць пацвердзіла трываласць меркавання Барыса Васільевіча і для сённяшняга дня: толькі ў суладдзі з жыццём журналістыка валодае стваральным патэнцыялам.

Даследчык па перакананні, Б. В. Стральцоў спаўна рэалізаваў свой творчы патэнцыял у доктарскім даследаванні праблем мадыфікацыі прадмета і функцый журналістыкі ў жанравых формах. Стральцоўская сістэма інфармацыйных, аналітычных і мастацкапубліцыстычных жанраў журналістыкі запатрабавана і сёння ў акадэмічных колах, а таксама сярод журналістаў-практыкаў. Даследаванне на дзесяцігоддзі перажыло вучонага. Але засталася памяць пра цудоўнага чалавека, асобу, прафесіянала, творцу, журналіста, настаўніка, даследчыка, вучонага, доктара філалагічных навук, прафесара, заслужанага дзеяча культуры Рэспублікі Беларусь.

Прамаўляючы імя Барыса Васільевіча Стральцова, выпускнікі журфака мяжы XX–XXI стст. не шкадуюць цёплых слоў, не скупяцца на ўспаміны, не абмяжоўваюцца ў слушных развагах рэтраспектыўным словам «быў». Часцей у настальгічных меркаваннях яны робяць акцэнт на аптымістычнай форме «ёсць» у журналісцкай творчасці кожнага паасобку і цэлых рэдакцыйных калектываў.

Школа Б. В. Стральцова – школа майстра. Яго даследчыцкая спадчына вельмі багатая і даволі разнастайная па напрамках і праблематыцы. Шматаспектнасць і шырыня навукова-даследчых інтарэсаў Барыса Васільевіча абумоўлена яго прафесійным крэда, асноўнымі палажэннямі якога з'яўляюцца наступныя:

- журналістыка – гэта лад жыцця;
- прафесію журналіста магчыма зразумець толькі на штодзённым інфармацыйным канвееры;
- толькі журналісты-прафесіяналы могуць навучыць журналіста-пачаткоўца працаваць кваліфікавана;
- журналістыка – прыкладная навука, яе мэтазгоднасць вымяраецца пошукам новага, эфектыўнага інструментарыю журналіста, абгрунтаваннем функцыянальнай дзейздольнасці сродкаў масавай інфармацыі, распрацоўкай «сотавай сувязі» паміж прадметам пазнання рэчаіснасці, прымяняемымі метадамі аналізу і адлюстравання, формамі творчага звароту да чытача, гледача, слухача[4].

Асэнсоўваючы інтэграваны падыход-формулу Б. В. Стральцова да адказнай місіі журналіста і даследчыка, педагога і навукоўца, можна адкрыць і спасцягнуць яго трапяткую, невычэрпную любоў да прафесіі, яго запаветную і ажыццёўленую мару «журналістам звацца бясконца»[5].

---

[4] *Стральцоў Б. В.* На шчасце і на бяду, журналістыка – гэта не толькі прафесія, але і лад жыцця // Рэспубліка. 1998. 25 верас. С. 9.

[5] *Стральцоў Б. В.* Я, напэўна, зноў пайшоў бы па журналісцкім шляху // Беларус. ун-т. 1996. 29 лістап. С. 1.

Абумоўленасць навукова-даследчага напрамку дзенняў Б. В. Стральцова жыццёва-прафесійным сталеннем асобы не выклікае сумненняў. Літаратурны супрацоўнік тагачаснай бабруйскай абласной газеты «Савецкая Радзіма», літработнік, загадчык аддзела рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», літаратурны супрацоўнік, загадчык аддзела літаратуры і мастацтва газеты «Звязда», з 1951 па 1969 г. ён знаходзіўся паміж «молатам» рэдакцыйных заданняў і «накавальняй» творчых памкненняў у журналісцкім цэху і на літаратурнай ніве.

Артыкул «Агнявы рубеж» – першы журналісцкі матэрыял, змешчаны ў 1948 г. на старонках вайсковай шматтыражкі «Советская армия» ў Германіі, сведчыў пра з'яўленне ў журналістыцы «агнявога» інфармацыйнага прафесіянала. А першая публікацыя на Радзіме, надрукаваная ў бабруйскай абласной газеце, датавана 1951 г. («Вясна ў Рассвеце»). Яна наканавала нараджэнне і росквіт будучага спрактыкаванага і аператыўнага інфармацыйшчыка, самабытнага нарысіста, пільнага і іранічнага даследчыка жыцця, мудрага аналітыка.

Здольнасць і схільнасць да аналітычнага ўспрымання свету, вобразнага мыслення і дакладнага адлюстравання рэчаіснасці ў публіцыстычнай манеры спарадзілі кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную тэме, якая і сёння не страціла сваёй запатрабаванасці, – «Газета і мараль». Нягледзячы на тагачаснае ідэалагічна-манапольнае гучанне праблемы, вытанчаны даследчык актуалізаваў на многія дзесяцігодзі наперад трыумвірат рэкамендацыйных прапаноў: маральны выбар – праўда жыцця – баланс інфармацыйнага патоку.

Практыкаарыентаванай стратэгіяй Б. В. Стральцова ў 1970–1980 гг. быў прадыктаваны выхад манаграфічных даследаванняў «Публіцыстычнасць інфармацыйных жанраў», «Аналітычныя жанры», «Публіцыстыка. Жанры. Майстэрства». На іх аснове была напісана доктарская дысертацыя «Праблемы мадыфікацыі функцый і прадмета публіцыстыкі ў газетных жанрах», абарона якой дазволіла ўвесці ў вучэбны працэс журфака пяць самастойных, але ўзаемазвязаных дысцыплін, якія закладваюць падмурак прафесійнага творчага сталення студэнтаў.

Натуральна, што пасля паспяховых даследчыцкіх і рацыянальных вучэбна-метадычных здзяйсненняў (змена тыпавога плана навучання ў Савецкім Саюзе – гэта сапраўды мужны ўчынак!) загадчык кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі змог рэалізаваць наступную высакародную задумку – стварэнне даследчай школы.

Пільная ўвага Б. В. Стральцова да развіцця здольных студэнтаў, падбор, замацаванне іх у даследчай майстэрні грунтаваліся на абавязковай наяўнасці практычнага журналісцкага вопыту. Сістэмныя захады неўзабаве прынеслі плён.

Пад кіраўніцтвам Барыса Васільевіча былі абаронены шматлікія кандыдацкія дысертацыі. Дыяпазон тэм і напрамкаў даследавання поліфункцыянальнай прыроды журналістыкі аб'яднаны асобай кіраўніка – Б. В. Стральцова. Яго бачанне перспектыў развіцця сродкаў масавай інфармацыі і практыкаарыентаваная мэтазгоднасць навуковага асэнсавання дыктавалі падбор вопытных прадстаўнікоў розных выданняў і фарміраванне беларускай даследчай школы журналістыкі.

На рубяжы стагоддзяў Барыс Васільевіч узначаліў спецыялізаваны савет па абароне доктарскіх дысертацый у галіне журналістыкі. Упершыню ў гісторыі на журфаку з'явілася магчымасць калектыўнай падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Гэтую магчымасць Б. В. Стральцоў бліскуча рэалізаваў на карысць факультэта і журналісцкай навукі Беларусі: 21 кандыдацкая і 4 доктарскія дысертацыі былі абаронены дзякуючы рэдактарска-кансультатыўнаму ўдзелу Барыса Васільевіча [4]. Гэтыя навукоўцы і сёння вызначаюць даследчы патэнцыял інфармацыйнай галіны Беларусі.

Каб быць паходняй, трэба свяціць[6]. Гэтага прынцыпу Барыс Васільевіч прытрымліваўся ўсё сваё жыццё. Ён заклікаў журналістаў да прафесійнага, кваліфікаванага, творчага ўдасканалення інфармацыйнай прасторы Беларусі: «Я перакананы, што над родам чалавечым раскінута разумная субстанцыя, імя якой – Вышэйшая Справядлівасць. І калі ты зрабіў свайму бліжняму, няхай не зусім знаёмаму, нешта добрае, гэта дабром адгукнецца табе, няхай і праз многія гады. Калі ж ты напаскудзіў, паскудства, памножанае на яшчэ большае паскудства, абрынецца на цябе. Іншага не дадзена»[7]. Іншага і нам не дадзена, таму што мы – вучні Б. В. Стральцова.

## Мажлівасці інавацыйных даляглядаў

Працэс стварэння ўдасканаленых адукацыйных стандартаў і вучэбных планаў (дадзеная падзея не за гарой, у Расіі гэты працэс ужо запушчаны) прымушае звярнуцца да «вечнай» праблемы кампетэнцый і вынікаў навучання па спецыяльнасці «Журналістыка», а таксама да пытання неабходнасці адкрыцця новых профіляў для шматаблічнай і шматфункцыянальнай медыягаліны.

Да абмеркавання гэтага надзённага і не вельмі ўпарадкаванага пытання падштурхоўвае імклівае разгалінаванне практычнай журналістыкі і медыяпрасторы. На фоне патрэбы ва ўніверсалізацыі на-

[6] *Стральцоў Б. В.* Каб быць паходняй, трэба свяціць // Вдохновение. 2011. 5 мая. С. 6.
[7] *Стральцоў Б. В.* Повязь // Рэспубліка. 2005. 21 студз. С. 3.

вучання студэнтаў па магістральнай спецыяльнасці журфака адмаўленне ад выкарыстання профіляў спецыяльнасці абмяжоўвае творчы і рэсурсна-структурны патэнцыял калектыву, стрыножвае плённасць вучэбнага працэсу.

Неабходным бачыцца абмеркаванне магчымасцей і даляглядаў увядзення новых профіляў побач з традыцыйнымі.

Безумоўна, важнай падзеяй можа стаць адкрыццё профіля «Медыяэкспертыза» з кваліфікацыяй «медыяэксперт». Сярод іншых магчымых і запатрабаваных спецыялізацый «Медыякамунікацыя» (кваліфікацыя «медыяменеджар»), «Тэлевізійная камунікацыя» (кваліфікацыя «арганізатар тэлевізійнай вытворчасці»), «Медыялогія» (кваліфікацыя «медыяаналітык сацыяльных камунікатыўных сетак»). Гэтыя прапановы патрабуюць крытычнага аналізу і ўсебаковага апаніравання. Яны не могуць быць прыняты адразу, таму што дасканаласць патрабуе часу на развагі. Але іх варыятыўнае ўкараненне наблізіць акадэмічныя зрухі і турботы журфакаўскага пераходу на новы стандарт і вучэбны план да клопатаў грамадства, выклікаў жыцця, запатрабаванняў адукацыйнай інтэграцыі ў розных фарматах медыйных аб'яднанняў.

З'яўляючыся істотным складнікам і якаснай канстантай грамадства і дзяржавы, журналістыка як палітычны і сацыяльны інстытут адлюстроўвае агульны стан і траекторыю развіцця соцыуму. Актуальныя тэндэнцыі фарміравання прынцыпова новага інфармацыйнага асяроддзя, яго глабалізацыі, трансфармацыі структуры і характару інфармацыйных патокаў, сцірання нацыянальных межаў, актыўнага развіцця інфармацыйных тэхналогій, індывідуалізацыі попыту і прапаноў масавай інфармацыі яскрава характарызуюць феномен СМІ ў свеце. Гэтыя працэсы, з'явы фарміруюць і новыя алгарытмы прафесійнай дзейнасці журналіста, медыяэксперта, медыяаналітыка і медыяарганізатара ў навейшы перыяд развіцця Беларусі, знітаваны з капіталізацыяй СМІ, стварэннем медыйнага рынку з яго жорсткай канкурэнцыяй, актыўным выкарыстаннем СМІ ў якасці палітычнага рэсурсу і сродку палітычнага ўплыву.

Інавацыйны характар акадэмічных зрухаў няўмольна вылучае сацыяльна-гуманітарны вектар журналісцкага пазнання і медыйнага адлюстравання рэчаіснасці ў адукацыйных стандартах і даследчых парадыгмах.

Змест і структура сённяшняга медыяспажывання заслугоўваюць сістэмнай і комплекснай даследчай увагі медыяэкспертаў, медыяаналітыкаў, медыяарганізатараў. Тэхналагічны фактар абумоўлівае напрамак змен у выкарыстанні медыя грамадскай супольнасцю для атрымання і засваення кантэнту, наладжвання сацыяльных сувязей і ўзаемадзеянняў. Аднак тэхналагізм не дамінуе над зменамі ў медыяспажыванні. Верагодныя моцныя фактары ўздзеяння на медыяспажыванне ўтрымліваюцца ў журналістыцы як творчай грамадска-палітычнай дзейнасці па зборы, апрацоўцы, інтэрпрэтацыі і распаўсюджванні інфармацыі. Фінансава-арганізацыйныя змены апошняга дзесяцігоддзя ў сістэме СМІ Беларусі, звязаныя з утварэннем буйных холдынгаў, таксама паўплывалі на інфармацыйныя запатрабаванні і чытацка-глядацкі інтарэс. Выбар паміж аналітыкай і «голай» фактурай на карысць апошняй у журналісцкай практыцы і медыйнай сетцы адштурхнуў традыцыйных прыхільнікаў друкаванага слова і тэлевізійнага малюнка ад адпаведных СМІ. Пошук журналістамі тэматыкі, крыніц фактаў засяродзіўся на электроннай рэальнасці, засланіўшы спачатку будні правінцыі, а потым і рэальнае жыццё людзей. Пералічаныя і іншыя фактары трансфармацыі медыяспажывання змяняюць новую канфігурацыю інстытуцыянальнасці журналістыкі ў эканамічным, палітычным і сацыяльным вымярэннях. Новыя медыя чакаюць спецыялістаў па медыяэкспертызе, медыяаналітыцы, медыяпрагнозу.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Булацкий ГВ. Кузница журналистских кадров Беларуси. *Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна. Серыя 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. Псіхалогія*. 1981;3:20–22.

2. Ткачоў ПІ. Учора, сёння, заўтра. *Маладосць*. 1982;5:15–17.

3. Слука АГ. Творчая лабараторыя. *Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Серыя 4, Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. Псіхалогія*. 1996;2:19–22.

4. Вараб'ёў ВП, рэдактар. *Журфак*. Мінск: БДУ; 2004. 306 с.

## References

1. Bulatskii GV. [Forge of journalistic personnel of Belarus]. *Vesnik Belaruskaga dzjarzhawnaga wniversitjeta imja U. I. Lenina. Seryja 4, Filalogija. Zhurnalistyka. Pedagogika. Psihalogija*. 1981;3:20–22. Belarusian.

2. Tkachow PI. [Yesterday, today, tomorrow]. *Maladosc'*. 1982;5:15–17. Belarusian.

3. Sluka AG. [Creative laboratory]. *Vesnik Belaruskaga dzjarzhawnaga wniversitjeta. Seryja 4, Filalogija. Zhurnalistyka. Pedagogika. Psihalogija*. 1996;2:19–22. Belarusian.

4. Vorobiev VP, editor. *Zhurfak* [The faculty of journalism]. Minsk: Belarusian State University; 2004. 306 p. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 10.09.2024.*
*Received by editorial board 10.09.2024.*